цвету и по форме, яркие купола и радужные цветовые ореолы вокруг окон, каждое из которых, следуя манифесту художника и «теории диктатуры окон и их права на самоопределение» [3, с. 32], живёт собственной жизнью.

Хундертвассер создал также множество планов и макетов «зелёных» пешеходных зон, шоссе, автозаправок и станций автообслуживания. В них он намеренно воздерживался от использования своих творческих изысков, акцентируя внимание на возможности реализации рациональных экологических идей.

В его манифестах и искусстве, будь то живопись или архитектура, торжествует сенсуализм. Подняв уровень австрийского искусства на волну профессионального и общественного интереса, он, тем не менее, вызывал негодование критиков тем, что столь рациональное искусство архитектуры не обладает минимальной долей логики. Что не мешало множеству других обретать наслаждение в огненной яркости объектов, которые сочинял и отправлял в мир Хундертвассер, декларируя экологическую бескомпромиссность.

**Литература**


1. *Hametner, K.* Hunderwasser-Haus. Wien: Verlag ORAC GesmbH & Co KG, 1988.
2. *Schmied, W.* Hundertwasser: Complete Graphic Work 1951-1976. Prestel USA, 2008.
3. *Ранд, Г.* Хундертвассер. Москва: Арт-Родник / Taschen, 2005.
4. *Уилер С.* Философские размышления об экологической архитектуре/ Пер. Г. Левитан // Строительство и недвижимость [Электронный ресурс]. - Режим доступа http://www.nestor.minsk.by/sn/1997/32/sn3220.htm.


# ГЕНЕАЛОГІЯ Ў ВЫРАШЭННІ ПРАБЛЕМ САЦЫЯЛЬНАГА СІРОЦТВА


**Т. С. Тамашэвіч**


Дзіця, якое страціла бацькоў, – гэта сапраўды трагічны свет, пакалечанае ў сваім зародку жыццё. Сацыяльнае сіроцтва вылучаецца з агульнай праблемы сіроцтва двайным болем страты, усведамленнем таго, што бацькі, самыя родныя, любыя людзі, адракліся ад цябе і не жадаюць нават ведаць. На жаль праблема гэта актуальна для нашага грамадства. Так, між агульнай колькасці дзяцей да 18 год на 2006 г. (1 868 572) колькасць сірот склала адпаведна 27 828. Самым жахлівым з’яўляецца тое, што працэнтная доля сацыяльных сірот сярод іх склала 90,3% [9, с. 15].

Сацыяльнае сіроцтва з’яўляецца праявай праблемы крызісу сям’і. У наш час назіраецца паслабленне бацькоўскіх і сужэнскіх сувязяў, падае

аўтарытэт бацькоў, «квітнеюць» п’янства і жорсткасць. Вынікам усяго гэтага з’яўляецца павелічэнне колькасці скасаваных шлюбаў: калі ў 1960 г. на 90,3 тыс. шлюбаў прыпадала 5,8 тыс. скасаванняў, дык у 2007 г. на 90,4 тыс. шлюбаў гэты паказчык склаў 36,1 тыс. Становяцца распаўсюджанымі грамадзянскія шлюбы. Як вынік гэтаму: колькасць дзяцей, народжаных у незарэгістраваным шлюбе, узрасла ў працэнтах ад агульнай колькасці народжаных з 7,3% у 1970 г. да 21,2% у 2007 г. Прыведзеныя дадзеныя дэманструюць высокі ўзровень сацыяльнай неабароненасці ў нашым грамадстве [4, с. 49–50; 7, с. 64, 73].

Зыходзячы з вышэй сказанага, неабходна адзначыць, што пошук тэхналогій грамадскай сацыяльнай абароны становіцца асабліва актуальным. Адной з такіх тэхналогій з’яўляецца «развіццё і практычная рэалізацыя ў соцыуме генеалогіі – навукі аб радаслоўных і роднасных сувязях, неабходных для самаідэнтыфікацыі асобы» [3, с. 85]. Нямецкі філосаф Роберт Шпеман у сваёй кнізе «Асноўныя паняцці маралі» піша: «Розныя пакаленні людзей выконваюць адно для аднаго ролю лёсу. Яны прымаюць свет такім, якім яго пакінулі папярэднія пакаленні… Таму сяброўства паміж пакаленнямі з’яўляецца ўмовай таго, каб гэты лёс, які ўладарыць над нашымі дзеяннямі, не стаўся занадта варожым» [10, с. 54].

Праблему сацыяльнага сіроцтва, як паказвае практыка, немагчыма перамагчы захадамі ўсынаўлення ці стварэння інтэрнатных установаў спецыяльнага тыпу. Жаданне мець бацьку і маці – адно з наймацнейшых жаданняў дзіцяці. «Усведамленне сіратой адсутнасці апоры на бацькоў нараджае пэўныя асаблівасці ў структуры псіхалогіі асобы: трапляючы ў інтэрнатную ўстанову, дзеці звычайна ўжо маюць адхіленні фізічнага і псіхічнага характару» [6, с. 32].

Адным з галоўных момантаў у развіцці асобы з’яўляецца псіхалагічны час асобы (індывідуальнае мінулае, сучаснае і будучае). Л.Н. Галігузава і Л.М. Царагародцава ў сваіх даследаваннях адзначаюць, што «развіццё асобы выхаванцаў дзіцячых дамоў характарызуецца адсутнасцю часавай перспектывы. Дзеці жывуць цяперашнім днём і не маюць ні мінулага, ні будучага, яны не ўмеюць фантазіраваць, да чагосьці імкнуцца» [1, с. 18–20].

Адсутнасць вопыту будавання сям’і закладвае патэнцыяльныя магчымасці нешчаслівага лёсу ў будучым пры стварэнні сваёй сям’і. «Чужы вопыт псіхалагічна не заўсёды прымальны. Вось тут і прыходзіць на дапамогу вопыт прародзічаў. Стварэнне сіраце магчымасці ўсвядоміць сваю прыналежнасць да пэўнага кола людзей, з якімі ў гэтага дзіцяці кроўнае адзінства, вядзе да разумення, што род мае глыбокія і разлапістыя карані, а з гэтым да абяздоленай асобы вяртаецца свой уласны свет. Псіхалагічны час наладжваецца: мінулае і будучае нібы

яднаюцца, што надае вялікую стваральную моц энергіі сэнсу жыцця» [5, с. 113–114].

Прыкладам неабходнасці рэалізацыі вышэй сказанага з’яўляецца даследаванне, якое праводзілася ў маі 2006 г. супрацоўнікамі кафедры сацыяльнай работы ДІКСТ БДУ на базе Валожынскай школы-інтэрната. З дапамогай кантэнт-аналізу імі былі праінтэрпрэціраваны сачыненні выхаванцаў на тэму «Што я павінен зрабіць, каб стаць сапраўдным чалавекам?» У выніку было высветлена, што ў якасці фактару станаўлення чалавека выхаванцы не вызначылі крытэрый «сям’я», таксама ў гэтых дзяцей адсутнічае яснае ўяўленне аб сэнсе ўласнага жыцця. Аўтары прапаноўваюць у якасці дапамогі шэраг логатэрапеўтычных тэхналогій, сярод каторых неабходна адзначыць асэнсаванне і распрацоўку ўласнага радаводу [2, с. 272].

На нашу думку, генеалогія – гэта зыходны штуршок да этычнага ўдасканалення чалавека. Яна вяртае чалавека да каштоўных здабыткаў культуры, якімі карысталіся нашы прашчуры. Прыкладам гэтага з’яўляецца Статут Вялікага княства Літоўскага. Пабудаваны на ідэях агульначалавечай маралі і хрысціянскай любові, ён умацоўваў сям’ю як сацыяльны інстытут, падтрымліваў сацыяльную справядлівасць у грамадстве. Так, у артыкуле 1 раздзела 6 «Аб апеках» адзначаецца, што «дзеці непаўналетнія, якія страцілі бацькоў, павінны быць пад наглядам апекуноў да паўналецця» [8, с. 118].

Такім чынам, генеалогія фарміруе гісторыю цэлай дзяржавы, аднаўляе ў кожным чалавеку любоў і павагу да самога сябе і іншых. Доказ гэтым словам кожны можа знайсці ў сваёй сям’і. Дзеля падцвярджэння гэтага намі было праведзена даследаванне сацыяльных дэтэрмінант здароўя ў генеалагічным дрэве сям’і Тамашэвіч: быў даследаваны радавод да чацвёртага калена ў складзе 18 чалавек. Намі былі выяўлена, што ўзаемаадносіны ў трэцім калене і папярэдніх будаваліся на аснове традыцый народнай педагогікі і хрысціянскай маралі. Такі прыклад жыцця прашчураў стаўся выратаваннем сям’і ад такіх наступстваў, як інваліднасць і сіроцтва.

У кантэксце вырашэння праблемы сацыяльнага сіроцтва намі плануецца правядзенне даследавання на базе дзіцячай школы-інтэрната №5 г. Мінска. Акрамя працы непасрэдна з выхаванцамі адным з аспектаў даследавання будзе вывучэнне падрыхтаванасці людзей, якія знаходзяцца ў родпасных сувязях з дзіцем-сіратой, да стварэння фонда абароны дзіцяці на парытэтных асновах з дзяржаўнымі структурамі.

**Літаратура**


1. *Галигузова, Л.Н.* Психологические аспекты воспитания детей в домах ребенка и детских домах / Л.Н. Галигузова, С.Ю. Мещерякова, Л.М. Царегородцева // Вопросы психологии. 1990. № 6. С. 17–25.
2. *Зборовский, Э.И.* Логотерапевтические технологии в коррекции социально-психологических проблем детей-сирот (исследование в Воложинской школе-интернате) / Э.И. Зборовский, Т.Н. Короткевич, Т.В. Тратинко // Социальная работа: теория, подготовка кадров, практика: материалы Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 2–3 нояб. 2006 г. / ГИУСТ БГУ; редкол.: Э.И. Зборовский [и др.]. Минск, 2007. С. 270–273.
3. *Зборовский, Э.И.* Общественная социальная защита и социовиталогия в теории и практике социальной работы / Э.И. Зборовский // Социальная работа: теория, подготовка кадров, практика: материалы Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 2–3 нояб. 2006 г. / ГИУСТ БГУ; редкол.: Э.И. Зборовский [и др.]. Минск, 2007. С. 83–87.
4. *Зборовский, Э.И.* Общественная социальная защита как направление развития социальной работы / Э.И. Зборовский // Научные труды Государственного института управления и социальных технологий БГУ / ГИУСТ БГУ; редкол.: П.И. Бригадин [и др.]. Минск, 2007. С. 46–65.
5. *Збароўскі, Э.І.* Ствары сябе, чалавек / Э. Збароўскі. Мн: Чатыры чвэрці, 2007. 252 с.
6. *Кухарев, Н.В.* Прогнозирование стратегии продуктивной педагогической деятельности интернатных учреждений / Н.В. Кухарев, М.Е. Кобринский. Минск: РИПО, 1998. 194 с.
7. Статистический ежегодник Республики Беларусь / М-во статистики и анализа Респ. Беларусь; редкол.: В.И. Зиновский [и др.]. М.: Информстат Минстата Респ. Беларусь, 2008. 598 с.
8. Статут Вялікага княства Літоўскага 1588 г. / пер. на бел. мову А.С. Шагун. Мн: Беларусь, 2002. 207 с.
9. *Хмелевский, В.М.* Проблемы социального сиротства в цифрах. 1990–2005 годы / В.М. Хмелевский, Г.С. Марчук // Информационный бюллетень. Вып. № 7. М.: ГИАЦ. Минобразования, 2006. 126 с.
10. *Шпеман, Р.* Основные понятия морали / Р. Шпеман. М.: Московский философский фонд, 1993. 74 с.